ВІЦЕБСКІ АБЛАСНЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

ВИТЕБСКИЙ ОБЛАСТНОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

## РАШЭННЕ

## РЕШЕНИЕ

24 ліпеня 2019 г. № 360

г. Віцебск

г. Витебск

Аб наданні статусу і катэгорыі гісторыка-культурнай каштоўнасці

На падставе падпункта 1.1 пункта 1 і пункта 7 артыкула 93, падпункта 4.1 пункта 4 артыкула 96 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, рашэння Віцебскага абласнога савета па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны ад 27 чэрвеня 2019 г. (пратакол № 3), Віцебскі абласны выканаўчы камітэт РАШЫЎ:

1. Надаць нерухомай матэрыяльнай культурнай каштоўнасці – ”Помнік ”Віцебскія вароты“ (датаванне каштоўнасці – 1977 г.), размешчанай у Віцебскім раёне, у в.Заполле, на ўсходнім баку вул.Савецкай, насупраць вострава на р.Усвяча, статус гісторыка-культурнай каштоўнасці і катэгорыю ”3“.

2. Надаць нерухомай матэрыяльнай культурнай каштоўнасці – ”Помнік на месцы бою 1812 года“ (датаванне каштоўнасці – 1912 г.), размешчанай у Віцебскім раёне, у аграгарадку Вароны, па вул.Садовая, перад домам № 10, статус гісторыка-культурнай каштоўнасці і катэгорыю ”3“.

3. Надаць нерухомай матэрыяльнай культурнай каштоўнасці – ”Шухаўская воданапорная вежа“ (датаванне каштоўнасці – 1929 г.), размешчанай у Талачынскім раёне, у аграгарадку Звянячы (паміж вул.Вакзальнай і перонам чыгуначнай станцыі ”Коханава“), статус гісторыка-культурнай каштоўнасці і катэгорыю ”3“.

4. Віцебскаму і Талачынскаму раённым выканаўчым камітэтам у месячны тэрмін:

4.1. арганізаваць падпісанне ахоўных абавязацельстваў;

4.2. забяспечыць падрыхтоўку пашпартоў на дадзеныя гісторыка-культурныя каштоўнасці.

5. Кантроль за выкананнем гэтага рашэння ўскласці на начальніка ўпраўлення культуры Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта.

Старшыня М.М.Шарснёў

Кіраўнік спраў А.У.Сысоеў

РЕСПУБЛИКА БЕЛАРУСЬ ВИТЕБСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ПРОТОКОЛЬНАЯ ЧАСТЬ город Витебск

Падгурскі 42 50 25